**Перад педагогамі зараз стаіць галоўная задача — сфарміраваць у кожным вучню якасці, уласцівыя сапраўднаму патрыёту, чалавеку, які любіць сваю Радзіму, захоўвае і прымнажае яе традыцыі. Менавіта ў традыцыях знаходзіць адлюстраванне духоўнае багацце народа.**




# Любім Купалу

Мы ў сваёй школе на чале з дырэктарам Васілём Уладзіміравічам Маліноўскім не толькі захоўваем традыцыі мінулага, але і закладваем новыя. І ў гэтых традыцыях стараемся выхаваць у навучэнцаў лепшыя якасці беларускага народа: міласэрнасць, душэўнасць, талерантнасць, гатоўнасць падзяліцца тым, што ў нас ёсць, павагу да памяці, любоў да Радзімы.

З 14 жніўня 1957 года наша школа носіць імя вядомага беларускага паэта Янкі Купалы, чалавека, які не толькі захаваў, данёс да нас беларускае слова, але і ў сваіх




танец. Не ўмееш — не бяда, навучаць! Ты мастак? Да тваіх паслуг яркія маркеры: падыходзь, малюй, размалёўвай! Ты пісьменнік, паэт? Тады табе знойдзецца справа ля стэнда-сэрца: успомні прыгожае і душэўнае слова на беларускай мове і падзяліся ім на цудоўным стэндзе! А для навучэнцаў пачатковай школы быў арганізаваны квест "Сцяжынкамі Купалы", які прыдумалі і правялі для іх адзінаццацікласнікі. А калі ты інтэлектуал, то для цябе інтэлектуальная гульня "Смак роднай мовы", у якой прынялі ўдзел зборныя каманды навучэнцаў 8, 9, 10 класаў і каманда педагогаў.

І гэта быў толькі пачатак шэрага мерапрыемстваў! Усе іх звязвае паміж сабой любоў да мовы продкаў, павага да традыцый беларускага народа і памяці народнага песняра Янкі Купалы. Кожны месяц — новае

У верасні для навучэнцаў быў арганізаваны спартыўны фестываль "Купалаўскі старт", дзе ў іх была магчымасць пагуляць у рухавыя беларускія гульні, у якія гулялі іх бабулі і дзядулі.

У кастрычніку запаліліся стартавыя агні акцыі "Купалаўскі радок": дзеці запісвалі выразнае чытанне верша Янкі Купалы, размяшчалі яго на YouTube-канале і падмацоўвалі хэштэгам #купалаўскірадок#першаяthebest.

У лістападзе навучэнцы зноў узброіліся фотаапаратамі, тэлефонамі і іншымі гаджэтамі — іх чакаў фотачэлендж #Што_сэрцу_міла. Трэба было зрабіць пастановачнае фота — ілюстрацыю да любога твора Янкі Купалы. Не-не ды і прамільгнуць пасля ўрокаў па калідоры дзяўчынкі і хлопчыкі ў беларускіх уборах.

А ў снежні вучнёўскі актыў наведаў Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы, дзе заўсёды чакаюць з асаблівым задавальненнем нашых дзяцей, "нашчадкаў Купалы" (як спяваецца ў нашым школьным гімне).

Студзень запрашаў дзяцей прыняць



творах вядзе нас па традыцыях беларускага народа. Для нашай школы Янка Купала сам даўно стаў традыцыяй: штогод у нас праходзяць Купалаўскія чытанні, гасцінна адчыняе свае дзверы "пакой Янкі Купалы", дзе сабраны розныя экспанаты, кнігі пра жыццё і творчасць паэта, не адзін раз тут праходзілі сустрэчы з беларускімі літаратарамі, жонкай Янкі Купалы Уладзіслаўай Луцэвіч. Частымі гасцямі гэтага пакоя з'яўляюцца і дашкаляты, якія прыходзяць сюды са сваімі выхавальнікамі, бацькамі. Для іх усё тут дзіўна, усё цікава, і яны хочуць сюды вярнуцца яшчэ. І часцей за ўсё вяртаюцца. Але вяртаюцца ўжо школьнікамі.

Але гэта нашы ранейшыя традыцыі. Летась, у год святкавання 140-годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы, у нашай школе з'явілася новая традыцыя. Васіль Уладзіміравіч Маліноўскі, чалавек, захоплены сваёй прафесіяй, які за кароткі перыяд свайго кіраўніцтва зрабіў шмат для нашай школы, да юбілейнай даты беларускага класіка арганізаваў фестываль мерапрыемстваў, прысвечаных 140-годдзю Янкі Купалы, "Люблю Купалу сэрцам…". Асаблівасць гэтых мерапрыемстваў у тым, што вядучымі формамі работы з дзецьмі з'яўляюцца сучасныя формы, блізкія дзецям: квест, чэлендж, флэш-моб і інш.

Адкрыццё фестывалю адбылося ў лютым 2022 года ў Дзень роднай мовы. Першым стаў Купала-фэст. У гэты дзень мерапрыемствы праходзілі на ўсіх паверхах школы. З самай раніцы навучэнцы школы ў нацыянальных касцюмах з прыгожымі прывітальнымі словамі на беларускай мове звярталіся да тых, хто заходзіў у школу: наведвальнікам было прапанавана перакласці словы з рускай мовы на беларускую. Гэтая акцыя захапіла ўсіх: дзеці і дарослыя дапамагалі адно аднаму, у выніку не засталося ні аднаго неперакладзенага слова.

Увесь дзень гучала беларуская музыка, песні на беларускай мове. Асноўныя мерапрыемствы праходзілі на другім паверсе. Ты танцор? Хлопчыкі і дзяўчынкі ў беларускіх касцюмах запрашаюць цябе на мерапрыемства.

У сакавіку прайшла школьная акцыя "І вечнасць радка, як вечнасць жыцця", дзе навучэнцы разам са сваімі класнымі кіраўнікамі рыхтавалі любімыя радкі з твораў Янкі Купалы, прыгожа афармлялі іх. Вызначылі лепшых шляхам анлайн-галасавання: тыя радкі, якія набралі найбольшую колькасць галасоў, знайшлі сваё месца ў фае другога паверха і застануцца там назаўсёды.

У красавіку нашы дзеці прынялі ўдзел у фота-флэш-мобе #ДзеньЯнкіКупалы: ім трэба было пабываць у месцах, звязаных з жыццём або творчасцю Янкі Купалы, сфатаграфаваць іх праз сілуэт беларускай выцінанкі.

У маі прайшоў арт-флэш-моб "Купалаў след": напярэдадні летніх канікул на асфальце перад школай навучэнцы пакінулі сваім педагогам на развітанне любімыя радкі з вершаў Янкі Купалы.

А выпускнікі нашай школы, далучыўшыся да Купала-фэсту, у якасці развітальнага падарунка заклалі алею Янкі Купалы, падарыўшы нам яшчэ адну традыцыю.

Не заціхаў наш фэст і ў перыяд летніх канікул. Дзеці прынялі ўдзел у чэленджы "Канікулы з Купалам": з розных мясцін, дзе ім давялося пабываць, яны дасылалі нам свае фатаграфіі з томікам Янкі Купалы ў руках. Аказалася, што кнігі — тыя яшчэ падарожнікі!

удзел у Купала-квесце "Я адкрываю Купалу", у якім сабраліся неабыякавыя да творчасці паэта.

І нібы ў коле часу, 21 лютага ў Дзень роднай мовы адбылося закрыццё марафону. А фінальным акордам стаў Купала-фэст. У гэты дзень у школьных фае працавалі фотазоны, былі арганізаваны гульнявыя майстар-класы: гульнявая праграма "Гульні.BY", харэаграфічныя замалёўкі "Вясёлы карагод", інтэлектуальныя гульні "Крыніцы роднай мовы", гульнявая праграма для малодшых школьнікаў "Крочым разам з роднай мовай", майстар-клас "Саламяныя карункі", акцыя "Рускай мове даём разгрузку — размаўляем па-беларуску", кніга-дайджэст "Чытайце беларускае", гастра-фэст "Беларуская гасцёўня".

Галоўнай падзеяй стала канцэртная праграма "Люблю Купалу сэрцам": удзельнікаў фестывалю і гледачоў парадавалі сваімі выступленнямі індывідуальныя выканаўцы, вакальныя і харэаграфічныя калектывы раёна, фальклорныя ансамблі. А кульмінацыяй фестывалю была цырымонія ўзнагароджання. Усе дзеці, якія прынялі ўдзел у мерапрыемствах, атрымалі дыпломы, а для пераможцаў з іншых устаноў адукацыі былі перададзены салодкія прызы.


**Наталля ВЯЖЭВІЧ,**
*намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце маладзечанскай сярэдняй школы № 1 імя Янкі Купалы.*


# Знаўцы мультфільмаў

**У дашкольным цэнтры развіцця дзіцяці Барысава прайшоў фінал раённага фестывалю аўтарскай дзіцячай мультыплікацыі "МультРасток".**

Гэта першы такі фестываль, арганізатарам якога выступіў дашкольны цэнтр развіцця пры садзейнічанні ўпраўлення па адукацыі Барысаўскага райвыканкама. Мэтай фестывалю стала творчае развіццё дзяцей дашкольнага ўзросту і пачатковай школы сродкамі анімацыі, а таксама наладжванне і ўмацаванне творчых сувязей паміж юнымі аніматарамі Барысаўскага раёна.

На фестываль было прадстаўлена 14 анімацыйных работ з 10 устаноў адукацыі: дзіцячых садоў №№ 23, 26, 41, 47, 49 Барысава, дашкольнага цэнтра развіцця дзіцяці Барысава, сярэдніх школ №№ 24, 8 Барысава, Навасельскай сярэдняй школы Барысаўскага раёна. Мультфільмы, прадстаўленыя на фестываль, былі зняты ў розных тэхніках: маляваная, лялечная, камп'ютарная анімацыя, пластылінавая мультыплікацыя, LEGO-анімацыя.

На фестывалі ўдзельнікі азнаёміліся з творчымі анімацыйнымі работамі: выхаванцаў устаноў дашкольнай адукацыі, навучэнцаў 1—4 класаў і сямейных творчых студый. Вядучая фестывалю педагог-псіхолаг дашкольнага цэнтра развіцця дзіцяці Барысава Ірына Сухарэбрая правяла з удзельнікамі віктарыну "Знаўцы мультфільмаў" і інтэрактыўную гульню "Стоп! Усім дзякуй, знята!".

Дыпломы і спецыяльныя салодкія прызы (тарты) былі ўручаны ад рэспубліканскага грамадскага аб'яднання "Белая Русь". Некалькі ўстаноў былі ўдастоены спецыяльных дыпломаў.

У канцы мерапрыемства старшыня Барысаўскай раённай арганізацыі РГА "Белая Русь" Уладзімір Васільеў падзякаваў арганізатарам за высокі ўзровень арганізацыі фестывалю, за сістэмную і выніковую работу па садзейнічанні творчаму, духоўнаму і інтэлектуальнаму развіццю выхаванцаў.


**Вольга ГАЙЛО,**
*намеснік загадчыка па асноўнай дзейнасці дашкольнага цэнтра развіцця дзіцяці Барысава.*